Справа №03п-10/2011 г.

# РАШЭННЕ
# ІМЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

17 мая 2011 г. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага суддзі Вярхоўнага Суда Кулік В.Г., пры сакратару Атрашэўскай В.В., з удзелам пракурора аддзела Генеральнай пракуратуры Ляўданскага У.У., прадстаўнікоў заяўніка Стральцова А.В., Вайцэховіча Д.Л. і Капуцкага А.А., прадстаўніка Міністэрства юстыцыі Зінкевіча В.В., прадстаўніка грамадскасці Чавусава Ю.В., разгледзеўшы ў зале судовых пасяджэнняў грамадзянскую справу па скарзе Рады Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвінаў" на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб адмове ў рэгістрацыі,

у с т а н а в і ў:

Прадстаўнікі Рады Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвінаў" звярнуліся ў суд са скаргай на рашэнне Міністэрства юстыцыі ад 16 сакавіка 2011 г. аб адмове ў рэгістрацыі аб'яднання на падставах яго неабгрунтаванасці і неправамернасці. У прыватнасці, у скарзе адзначана, што беспадстаўным з'яўляецца сцвярджэнне рэгіструючага органа, што такі метад дзейнасці аб'яднання, прадугледжаны падпунктам 2.4. Статута, як ажыццяўленне вытворчасці сувеніраў, супярэчыць арт.20 Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях". Спіс заснавальнікаў аб'яднання, які прадстаўлены ў рэгіструючы орган, адпавядае патрабаванням заканадаўства. Таму заяўнікі прасілі прызнаць рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі неправамерным і адмяніць яго.

У судовым пасяджэнні прадстаўнікі заяўніка Стральцоў А.В., Вайцэховіч Д.Л. і Капуцкі А.А. скаргу падтрымалі, спасылаючыся на абставіны, выкладзеныя ў скарзе, і дадаткова ўдакладнілі, што ажыццяўленне вытворчасці сувеніраў як адзін з метадаў дзейнасці аб'яднання, не супярэчыць яго мэтам і іншым палажэнням Статута, а подпіс спіса заснавальнікаў аб'яднання толькі двума членамі кіруючага органа з'яўляецца тэхнічнай і выпраўляльнай памылкай.

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Зінкевіч В.В. са скаргай не пагадзіўся і растлумачыў, што такі метад дзейнасці аб'яднання, як ажыццяўленне вытворчасці сувеніраў, не адпавядае яго статутным мэтам і задачам, а подпіс спіса заснавальнікаў аб'яднання по Магілеўскай вобласці толькі двума членамі кіруючага органа супярэчыць п.6 Інструкцыі, зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі, якой рэгламентаваны парадак афармлення і разгледжання дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй грамадскіх аб'яднанняў.

Прадстаўнік грамадскасці – гарадскога грамадскага аб'яднання "Цэнтар Супольнасьці" Чавусаў Ю.В. прасіў скаргу задаволіць.

Заслухаўшы тлумачэнні прадстаўнікоў заяўніка і Міністэрства юсты прадстаўніка грамадскасці, даследаваўшы пісьмовыя доказы, заслуха меркаванне пракурора аб тым, што скарга не падлягае задавальненні падставе допушчаных парушэнняў Інструкцыі аб парадку дзяржа рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў, суд прыходзіць да наступнага.

Устаноўлена, што 15 студзеня 2011 г. у г.Мінску адбыўся ўстаноўчы Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвінаў". Міністэр юстыцыі, разгледзеўшы прадстаўленыя аб'яднаннем дакументы, рашэнне 16 сакавіка 2011 г. адмовіла ў яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

Падставамі для прыняцця Мінюстам такога рашэння ў лісце, накіраваз 17 сакавіка 2011 г. у адрас кіраўніцтва аб'яднання, зазначана, ажыццяўленне вытворчасці сувеніраў як адзін з метадаў дзейнасці аб'ядна не адпавядае статутным мэтам і супярэчыць арт.20 Закона "Аб грамад аб'яднаннях", а таксама не прадстаўлены неабходныя для дзяржаў рэгістрацыі дакументы, што выявілася ў адсутнасці подпісаў трох чле кіруючага органа на спісе заснавальнікаў аб'яднання ад Магілеўскай вобласі

У адпаведнасці з ч.3 арт.20 Закона "Аб грамадскіх аб'яднанн аб'яднанні могуць ажыццяўляць ва ўстаноўленым пара прадпрымальніцкую дзейнасць толькі, паколькі яна неабходна для іх статут мэт, для якіх яны створаны, адпавядае гэтым мэтам і прадмету дзейна грамадскага аб'яднання.

Падпунктам 2.1. Статута аб'ядання прадугледжана, што мэт Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвінаў" з'яўляюцца вылава і адраджэнне нацыянальна-культурнай самасвядомасці літвінаў Белар кансалідацыя літвінскай супольнасці як складовай часткі народу Рэспуб Беларусь, спрыянне росту павагі да гісторыка-культурнай спадчыны літвін умацаванне дружбы літвінаў з іншымі народамі, што пражываюць на тэрытор Рэспублікі Беларусь.

Для дасягнення статутных мэтаў, як вызначана ў падпункту 2.4. Стату аб'яднанне вырашае задачы ў адпаведнасці з заканадаўствам і пры дапам шэрагу метадаў, адным з якіх азначана ажыццяўленне вытворчасці сувеніраў.

Акрамя гэтага падпунктам 7.2. Статута ўстаноўлена, ш прадпрымальніцкую дзейнасць, неабходную для дасягнення статутных мэт аб'яднанне ажыццяўляе толькі праз стварэнне камерцыйных арганізацый аль удзел у іх, у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, указанне ў Статуте на ажыццяўленне вытворчасці сувенір як аднаго з метадаў дзейнасці, адпавядае палажэнням Статута аб'яднання і супярэчыць патрабаванням заканадаўства, таму адмову ў рэгістрац грамадскага аб'яднання на гэтай падставе нельга прызнаць абгрунтаванай.

Што тычыцца прадстаўленых да дзяржаўнай рэгістрацыі дакументаў, спіс заснавальнікаў аб'яднання, у адпаведнасці з арт.13 Закона "Аб грамадскі аб'яднаннях", адносіцца да дакумента, які абавязкова прадстаўляец рэгіструючаму органу.

Пунктам 6 Інструкцыі аб парадку афармлення і разгляду дакумента звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй палітычных партый, іншых грамадскі

аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама рэгістрацыі, пастаноўкі на улік зняцце з уліку іх арганізацыйных структур, зацверажанай Пастановаі Міністэрства юстыцыі 30 жніўня 2005 г., прадугледжана, што спіс заснавальнікаў аб'яднання падпісваюцца не меней чым трыма членам кіруючага органа.

Устаноўлена, што Мінюсту прадстаўлен не адзіны спіс заснавальнікаў аб'яднання, а спісы заснавальнікаў па Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай Брэсцкай абласцях і г.Мінску. Спіс па Магілёўскай вобласці падпісаны тольк двума членамі кіруючага органа, што супярэчыць вышэйназванай Інструкцыі сведчыць аб прадстаўленні грамадскім аб'яднаннем дакумента, які н адпавядае патрабаванням заканадаўства.

Фактычна прадстаўнікі заяўніка ў сваіх тлумачэннях суду прызнал наяўнасць недахопаў у спісе заснавальнікаў аб'яднання па Магілеўска вобласці. Аб гэтым сведчыць і той факт, што спісы заснавальнікаў па іншы абласцях падпісаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі нарматыўнага прававог акта.

Спасылкі на тое, што гэты недахоп выпраўляемы і Мінюст павінен бы прыняць рашэння аб прыпыненні рэгістрацыі аб'яднання для яго выпраўленн суд лічыць неабгрунтаванымі, таму што рашэнне гэтых пытанняў тычыц кампетэнцыі Міністэрства юстыцыі і з'яўляецца правам, а не абавязка рэгіструючага органа.

У адпаведнасці з ч.3 арт.15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадск аб'яднаннях" рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадска аб'яднання прымаецца ў выпадку, у прыватнасці, прадстаўлення дакументаў, н адпавядаючых патрабаванням заканадаўства.

Такім чынам, паколькі выяўленае парушэнне з'яўляецца падставай дл адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання, рашэнне Мінюс правамерна і адпавядае заканадаўству, скарга на гэтай падставе задавальненн не падлягае.

Кіруючыся арт. 302 ГПК Рэспублікі Беларусь, суд

в ы р а ш ы ў:

адмовіць Радзе Грамадскага аб'яднання "Краёвае Згуртаванне Літвіна у задавальненні скаргі на рашэнне Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Белару ад 16 сакавіка 2011 г. аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі.

Рашэнне ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэнн абскарджанню і апратэставанню ў касацыйным парадку не падлягае.

Старшынствуючы
суддзя Вярхоўнага Суда
Рэспублікі Беларусь

В.Г.Кулік

Сапраўдна:
суддзя Вярхоўнага Суда

В.Г.Кулік

Вярхоўны Суд Рэспублікі